УДК 947.6:004.738.5

А.А. Райчонак, асістэнт

# ПРАБЛЕМЫ ВЫКАРЫСТАННЯ ІНТЭРНЭТУ Ў СУЧАСНЫМ ГІСТАРЫЧНЫМ ДАСЛЕДАВАННІ

The problems concerned with the use of Internet in historical research are being examined in this article.

Сучаснае грамадства характарызуецца тым, што інфармацыя і інфармацыйныя тэхналогіі становяцца галоўным рэсурсам развіцця як навукі, так і грамадства ўвогуле [1]. Таму і ў гістарычнай навуцы наспела неабходнасць выкарыстоўвання новых інфармацыйных тэхналогій, і Інтэрнэту ў прыватнасці. Гэта тлумачыцца наступнымі прычынамі.

Па-першае, у час, калі камп'ютэрызацыя набывае сусветныя маштабы, гісторыкі не могуць заставацца ў баку ад гэтага працэсу, тым больш што Інтэрнэт і «Сусветная павуціна» адкрываюць перад гістарычнай навукай новыя шырокія перспектывы: ад простай перадачы файлаў да правядзення тэлеканферэнцый.

Па-другое, праца гісторыка шмат у чым складаецца з аналізу велізарных масіваў дакументаў. Інтэрнэт як глабальная сістэма, складзеная з мноства звязаных паміж сабой камп'ютэрных сетак і «сусветнай павуціны» (World Wide Web – WWW) – службы Інтэрнэту, якая звязвае дакументы пры дапамозе выкарыстання гіпертэкставай тэхналогіі, дазваляе значна, на некалькі парадкаў, скараціць час на атрыманне і апрацоўку патрэбных даследчыку матэрыялаў.

Па-трэцяе, пастунова з'яўляецца масіў даных, не маючых друкаванага аналага і існуючых толькі ў электронным выглядзе. Гэта як публікацыі даследчыкаў (артыкулы, тэзісы, гістарычныя форумы і г. д.), так і новыя першакрыніцы, асабліва па сучаснай гісторыі.

Акрамя таго, высокі сабекошт друкаваных выданняў, асабліва пры малых накладах, робіць мэтазгодным стварэнне іх электронных копій, бо ў іншым выпадку яны могуць застацца недаступнымі для большай часткі даследчыкаў.

Інтэрнэт-публікацыі магчыма падзяліць на 5 асноўных груп: 1) электронныя перавыданні існуючых папяровых публікацый; 2) электронныя публікацыі крыніц, якія раней не друкаваліся традыцыйным сродкам; 3) перавыданне ў электронным выглядзе раней існаваўшых у традыцыйным выглядзе публікацый, перапрацаваных самім аўтарам; 4) перавыданне ў электронным выглядзе шырока вядомай крыніцы, якая многа разоў друкавалася ў традыцыйным выглядзе, але з аўтарскім каментарыем стваральніка сайта ці асабістым перакладам асобных дакументаў; 5) перавыданне ў электронным выглядзе раней існаваўшай у традыцыйным выглядзе публікацыі, калі пры гэтым стваральнікі сайта выпраўляюць памылкі ў каментарыях, заўвагах і г. д. [2].

Што тычыцца беларускага сегмента Інтэрнэту, то тут пераважаюць першая і другая групы публікацый. Гэта абумоўлена яшчэ адносна слабым выкарыстаннем Інтэрнэту сярод прафесійных гісторыкаў Беларусі. Хаця за апошні час колькасць інтэрнэт-публікацый па гісторыі Беларусі значна павялічылася, што выклікала з'яўленне асобных старонак на інтэрнэт-парталах, але фактычна адсутнічаюць матэрыялы па найноўшай гісторыі Беларусі.

Акрамя таго, праца з Інтэрнэтам ставіць перад даследчыкам шмат пытанняў, без тэрміновага вырашэння якіх немагчыма эфектыўна выкарыстоўваць пералічаныя вышэй перавагі.

Асноўнай перавагай Інтэрнэту, якая дазваляе эканоміць час даследчыка, з'яўляецца аддалены доступ. Гэта метад выкарыстання электроннага рэсурсу аднаго камп'ютэра пры дапамозе другога, калі карыстальнік не мае непасрэднага доступу да фізічнага носьбіта.

Пры гэтым электронныя рэсурсы могуць захоўвацца на дзесятках, сотнях (і г. д.) не звязаных паміж сабой фізічных носьбітах, што належаць розным арганізацыям ці прыватным асобам. У адрозненне ад звычайных інфармацыйных рэсурсаў, захоўванне якіх з'яўляецца цэнтралізаваным і фармалізаваным, электронныя рэсурсы аддаленага доступу не валодаюць на сённяшні час такімі перавагамі і могуць быць фізічна знішчаны ўладальнікам электроннага носьбіта.

Сярод мноства электронных рэсурсаў для гісторыкаў найбольш важнымі з'яўляюцца тэкставыя даныя, якія складаюцца ў асноўным з тэкставай інфармацыі. Для захоўвання тэкставай інфармацыі зараз выкарыстоўваюцца розныя фарматы: html, htm, doc, pdf, rtf, txt і г. д., пры гэтым большасць дакументаў аддаленага доступу захоўваецца ў фарматах html і htm, якія зручныя для прагляду, але зусім не зручныя для цытавання ці спасылак на асобныя часткі. У той час як больш зручныя для гэтай мэты фарматы pdf ці doc выкарыстоўваюцца значна радзей.

Да сённяшняга часу на Беларусі не распрацавана адзіная сістэма спасылак на інтэрнэт-рэсурсы ў друкаваных выданнях. У сучаснай гістарычнай літаратуры ў якасці спасылак выкарыстоўваюць і Web-сайт цалкам, і дамашнюю старонку (галоўны ці пачатковы экран тэкставага дакумента), і Web-старонку. Пры гэтым назва дакумента можа стаяць як перад уніфікаваным паказчыкам рэсурсу, так і пасля яго. Да гэтага ж непасрэдна прымыкае праблема перавагі спасылкі на электронную ці друкаваную крыніцу.

Праілюструем вышэйсказанае на прыкладзе спробы выкарыстання інтэрнэт-публікацый пры даследаванні станаўлення беларускай дзяржаўнасці ў пачатку XX ст. Так, у прыватнасці, спыніў сваё існаванне сайт «Гісторыя Цэнтральнай і Усходняй Еўропы», і спасылкі на даволі цікавыя артыкулы па праблемах дзяржаўнасці ў дадзеным рэгіёне, якія там змяшчаліся, становяцца ўжо немагчымымі. А спроба аўтара адшукаць тыя ж артыкулы на іншых сайтах засталася безвыніковай. Тое ж самае тычыцца, напрыклад, артыкула С. Крапівіна, прысвечанага А.Ф. Ульянаву, і г. д. Усё пералічанае робіць мэтазгодным стварэнне архіва электронных гістарычных матэрыялаў (напрыклад, «цвёрдых» копій на CD-дысках з захоўваннем апошніх у звычайных бібліятэках [3]), хаця зразумела, што толькі намаганняў энтузіястаў тут будзе недастаткова.

Возьмем іншую праблему – выкарыстанне таго ці іншага фармату. Калі матэрыял невялікі, напрыклад «И. Барциц. История российско-белорусских отношений в 1917–1922 годах», змешчаны па адрасу http//www.nasledie.ru/oboz/N08_00/08_08.htm, то тут можна спаслацца на яго цалкам, бо пошук неабходнага месца не зойме шмат часу. Калі ж матэрыял вялікі, як, напрыклад, «Хоміч С. Цяжар выбару: дзяржаўнае будаўніцтва Беларусі (1917–20 гг.) (http://newsletter.iatp.by/ctr4-7.htm), то цытаванне з яго даволі цяжкае і трэба дадаткова указваць на неабходнасць карыстання пошукам па поўнаму супадзенню, а ў дачыненні да асобных дакументаў змяшчаць іх пад нумарамі, як гэта, напрыклад, зроблена на сайце «Судьбы национальных меньшинств на Смоленщине 1918–1938 гг. Документы и материалы», змешчаным па адрасу http://orel.rsl.ru/vers_may2000/books/html/smol_fr/frame.htm, дзе не толькі захоўваецца пастаронкавае афармленне ўсяго матэрыялу, але кожны дакумент даецца пад асобным нумарам.

Да таго ж няма адзінай сістэмы бібліяграфічнага афармлення спасылак на электронныя матэрыялы. Так, у публікацыях беларускіх гісторыкаў (праўда, гэта пакуль што адзінкавыя выпадкі) спасылка звычайна даецца ў такім выглядзе: http://www.auditorium.ru/books/1131/index.html. Программные документы национальных политических партий и организаций России (конец XIX в. – 1917 г.). А ў метадычнай рэкамендацыі расійскага міжрэгіянальнага камітэта па каталагізацыі «Библиографическое описание электронных ресурсов» [4] прапануецца наступны парадак: Исследовано в России [Электронный ресурс]: многопредмет. науч. журн. / Моск. физ.-техн. ин-т. – Электрон. журн. – Долгопрудный: МФТИ, 1998. – Режим доступа к журн.: http://zhurnal.mipt.rssi.ru. Такі парадак падаецца больш зручным, бо набліжаны да сістэмы спасылак на друкаваныя

выданні, якая выкарыстоўваецца ў нашай краіне.

Акрамя таго, пакуль не высветлена пры наяўнасці электроннага і друкаванага варыянтаў тэксту, якому з іх аддаць перавагу пры спасылцы. З аднаго боку, нормай з'яўляецца спасылка на апошнюю публікацыю, але шэраг пералічаных вышэй цяжкасцяў прымушае схіляцца на бок друкаваных выданняў.

Да вышэйадзначаных праблем непасрэдна прымыкае праблема аўтарства і дакладнасці інфармацыі.

Зразумела, што гісторыкі пакрыху спрабуюць пераадолець гэтыя цяжкасці. Так, цікавую інфармацыю па асобных баках дадзенай праблемы можна знайсці ў артыкулах В. Насевіча, змешчаных па адрасу http://vn.belinter.net/digit.html, а таксама ў артыкуле: Владимиров В.Н. Интернет для историка: еще не парадигма, но уже не игрушка (http://www.ab.ru/~kleio/aik/otchet.shtml), дзе прапануюцца пэўныя сродкі для вырашэння вышэйзгаданых складанасцяў.

## ЛІТАРАТУРА


1. Попов И.И. Информационные ресурсы и системы: реализация, моделирование, управление. М.: ТПК «Альянс», 1996.
2. Боброва Е.В. Анализ археографического уровня подготовки документальных публикаций в российском сегменте Интернет // Информационный бюллетень Ассоциации «История и компьютер». № 30. М., 2002. С. 81.
3. Валетов Т.Я. Проблемы организации электронных ресурсов по истории. М., 2002. С. 79.
4. Библиографическое описание электронных ресурсов: Методические рекомендации / Российская государственная библиотека, Межрегиональный комитет по каталогизации; Сост. Т.А. Бахтурина, И.С. Дудник, Н.Ю. Кулыгина. М., 2001.